Источник: "Гісторыя і грамадазнаўства" - № 1, 2013-01-25

# Спасцігаем гісторыю

**В. В. Даніловіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі



У сучасных умовах, зыходзячы з дзяржаўных пазіцый, Інстытут гісторыі НАН Беларусі не толькі ажыццяўляе навуковыя даследаванні, але і імкнецца развіваць прыкладны напрамак сваёй дзейнасці, пашыраць гістарычную асвету, прапагандаваць гісторыка-культурныя традыцыі Бацькаўшчыны. Разам з тым мы выдатна ўсведамляем праблемы, якія стаяць перад сучаснай гістарычнай навукай Рэспублікі Беларусь, і праводзім работу па аб'яднанні намаганняў гісторыкаў для іх вырашэння.

Намаганні вучоных Інстытута гісторыі НАН Беларусі, гістарычных кафедраў ВНУ ў рамках выканання заданняў падпраграмы «Гісторыя, духоўная і матэрыяльная культура беларускага народа» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2011—2015 гг. «Гуманітарныя навукі як фактар развіцця беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі» пры падтрымцы кіраўніцтва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў, за што мы ўдзячны акадэміку-сакратару А. А. Каваленю, канцэнтруюцца на актуальнай праблематыцы, канцэптуальных навуковых і метадалагічных пытаннях у трактоўцы шматвекавой гісторыі беларускага народа.

Можна канстатаваць узрастанне цікавасці да метадалогіі даследавання гісторыі. Па сутнасці, сённяшні форум з'яўляецца традыцыйным, бо гэта ўжо трэцяя канферэнцыя, прысвечаная метадалогіі даследаванняў гісторыі Беларусі. Першая адбылася 26—27 кастрычніка 2006 г., другая — 22—23 кастрычніка 2008 г. Гэтыя метадалагічныя канферэнцыі ўзнялі цэлы шэраг важных для айчыннай гістарычнай навукі пытанняў.

Так, была агучана прапанова праводзіць на ўзроўні агульнанацыянальных выданняў навуковыя дыскусіі па актуальных праблемах метадалогіі, гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і ўвогуле гісторыі Беларусі. Адзначана запатрабаванасць аналізу гістарычных каранёў і крыніц беларускай дзяржаўнасці, шляхоў, формаў і метадаў яе эвалюцыі, фарміравання ідэалогіі дзяржаўнасці на розных этапах жыцця і дзейнасці народа.

У сувязі з 90-годдзем абвяшчэння БНР вучонымі Інстытута гісторыі НАН Беларусі ў 2008 г. у рэдакцыі газеты «СБ — Беларусь Сегодня» быў арганізаваны круглы стол, прысвечаны гісторыі Беларускай Народнай Рэспублікі. Падзеяй дзяржаўнай значнасці стала Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Беларусь: этапы станаўлення дзяржаўнасці (да 90-годдзя ўтварэння БССР)», праведзеная 18 снежня 2008 г. У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел больш за 230 навукоўцаў, прадстаўнікі органаў улады, дыпламатычнага корпуса, а таксама дэпутаты: Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Б. В. Батура, глава Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі

Беларусь У. У. Макей, Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь Р. А. Васілевіч, Старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі М. У. Мясніковіч, Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь А. М. Радзькоў і іншыя.

Важным этапам апрабацыі напрацовак па найноўшай гісторыі Рэспублікі Беларусь стала арганізаваная 24—25 лістапада 2011 г. сумесна з Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Рэспубліка Беларусь. 20 гадоў незалежнасці», у якой прынялі ўдзел больш за 180 вучоных.

Вялікую карысць у справе пашырэння сярод беларускага грамадства найноўшых айчынных канцэптуальных напрацовак у галіне гістарычнай навукі меў праведзены 23 сакавіка 2012 г. у рэдакцыі газеты «Звязда» круглы стол на тэму «На чым заснавана дзяржаўнасць Беларусі?».

Найноўшыя дасягненні гістарычнай думкі, канцэптуальныя метадалагічныя падыходы знайшлі адлюстраванне ў такіх знакавых для ўсёй краіны акадэмічных выданнях, як першы том унікальнага трохтомнага «Вялікага гістарычнага атласа Беларусі» (Мінск, 2009), які з'яўляецца плёнам творчага супрацоўніцтва вучоных Інстытута гісторыі НАН Беларусі, Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белкартаграфія», Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь і Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь; калектыўная манаграфія «Беларусь: Народ. Государство. Время» (Мінск, 2009), дзе ўпершыню ў гісторыі нашай краіны на аснове нацыянальна-дзяржаўнай ідэалогіі прадстаўлена гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сучаснасці, раскрыты месца і роля беларускага народа ў развіцці еўрапейскай цывілізацыі. Гэта выданне стала пераможцам у намінацыі «Лепшае масава-палітычнае выданне» Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі — 2010», атрымала Дыплом пераможцы і Гран-пры Міжнароднага конкурсу «Навуковая кніга — 2010», які адбыўся ў Маскве. У першай кнізе калектыўнай манаграфіі «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII — пачатку XXI ст.» (Мінск, 2011) прааналізаваны перадумовы, якія садзейнічалі фарміраванню нацыянальна-дзяржаўнай ідэі беларускага народа, складаны працэс афармлення беларускай дзяржаўнасці, комплексна асветлены і абгрунтаваны яе асаблівасці на розных гістарычных этапах.

Сапраўдным прарывам у гістарыяграфіі Беларусі, Расіі і Украіны стала паспяховая рэалізацыя ў 2007—2010 гг. акадэмічнымі гісторыкамі трох краін сумеснага навуковага даследавання «1941 г.: краіна ў полымі» па комплексным вывучэнні гісторыі пачатку Вялікай Айчыннай вайны. У выніку з прыцягненнем новых дакументаў, выяўленых у архівах Беларусі, Расіі, Украіны і Германіі, апублікаваны калектыўная манаграфія і зборнік дакументаў і матэрыялаў («1941: Страна в огне». — Кн. 1. «Очерки». — М., 2011) ; кн. 2. «Документы и материалы». — М., 2011), якія прадстаўляюць цэласную карціну падзей 1941 г., што адпавядае іх бачанню гісторыкамі Расіі, Беларусі і Украіны. У іх змешчана вялікая колькасць найноўшых факталагічных і статыстычных даных, тэарэтычных абгрунтаванняў. Гэта першая пасля распаду СССР буйная міжнародная гістарычная праца аб пачатковым этапе Вялікай Айчыннай вайны. Развіццём трохбаковага даследавання з'яўляецца распрацоўка сумеснага навуковага праекта «Краіна ў полымі. Гады карэннага пералому, 1942—1943».

У 2008—2010 гг. вучонымі Інстытута гісторыі НАН Беларусі і Інстытута расійскай гісторыі РАН выкананы цікавы навукова-даследчы праект «На шляхах індустрыяльнай мадэрнізацыі: параўнальны аналіз працэсаў у Расіі і Беларусі ў XX стагоддзі». У ім упершыню ў адзіным тэарэтыка-метадалагічным і канкрэтна-гістарычным даследаванні выяўлены агульныя і асаблівыя рысы індустрыяльнай мадэрнізацыі ў Расіі і Беларусі ў XX ст. у кантэксце рэвалюцый, рэформаў, трансфармацый. Удзельнікі метадалагічных навуковых форумаў адзначалі як важны напрамак працы вучоных-гісторыкаў узаемадзеянне з Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

У 2008 г. адбылося пасяджэнне па пытаннях выдання падручнікаў для сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. На ім абмяркоўваліся метадалогія даследавання і метадалогія выкладання гісторыі ў школе і ВНУ. Пры гэтым аказаліся карыснымі напрацоўкі акадэмічных метадалагічных канферэнцый, што пацвердзіла іх навукова-практычны статус.

Прыкладам аб'ектыўнага навуковага падыходу да стварэння вучэбнай і метадычнай літаратуры з'яўляецца вучэбна-метадычны

комплекс «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» (Мінск, 2006—2009), які ўключае праграму, падручнік, даведнік, рабочы сшытак, хрэстаматыю, дапаможнік для настаўніка, і прызнаны лепшым сярод краін СНД.

У гістарычнай навуцы Беларусі існуе неабходнасць працягу і пашырэння даследаванняў ролі і месца беларускіх зямель у складзе ВКЛ, Расійскай імперыі і СССР. Па-ранейшаму актульна ўсебаковае вывучэнне агульнасці гістарычнага лёсу народаў, якія ўтвараюць адзіную ўсходне-славянскую цывілізацыю.

Спасціжэнне гісторыі, выкарыстанне розных даследчыцкіх падыходаў пры яе вывучэнні патрабуе міждысцыплінарных намаганняў, асэнсавання з метадалагічнага пункту гледжання месца гістарычных ведаў у сістэме сучаснага грамадазнаўства. Навуковы і практычны інтарэс маюць пытанні метадалагічнага ўзаемадзеяння, тэорыя і метады гістарычнага даследавання.

Рыхтуючы канферэнцыю, мы хацелі б, каб яе ўдзельнікі прадставілі найноўшыя даследаванні па гісторыі Беларусі ў люстэрку парадыгмаў XXI ст. Пажадана, каб у нас была зацікаўленая і прафесійная размова аб навацыях, дасягненнях і праблемах у гістарычнай метадалогіі, гістарыяграфіі і крыніцазнаўстве, у распрацоўцы і выкладанні палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай гісторыі, дапаможных гістарычных дысцыплін.